Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, №4(55), Ч1, 2009

*УДК 930.1*

# Хэйдэн Уайт і Поль Рыкёр аб структуры гістарычнага тлумачэння

В. У. Цацарын

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Філасофія гісторыі – філасофскі раздзел, які добра развіты ў заходняй традыцыі, але практычна адсутнічае ў нас. Доўгі час усе айчынныя гісторыкі і філосафы карысталіся марксісцкім падыходам да гісторыі, таму філасофія гісторыі была непатрэбна. У сучаснай сітуацыі вывучэнне заходняй філасофіі гісторыі падаецца актуальным як для пасціжэння накопленага вопыту, так і для выпрацоўкі свайго падыходу да праблемы.

Хэйдэн Уайт (нар. у 1928) – прафесар ва Універсітэце Каліфорніі (г. Санта-Круз). Выказаў цікавыя меркаванні па праблемах філасофіі гісторыі. Паставіўшы пад сумненне прыналежнасць гісторыі да навук (шмат у чым з-за непрыняцця пазітывісцкіх поглядаў на гісторыю), паказаў роднаснасць гісторыі і літаратуры. На яго думку, гістарыяграфія павінна выкарыстоўваць дасягненні як сучаснай навуковай тэорыі, так і мастацкага выражэння, каб для розных бакоў гістарычнага мінулага знайсці адпаведныя формы выражэння.

Поль Рыкёр (нар. у 1913) – прафесар Сарбонны, Страсбургскага і Чыкагскага універсітэтаў. Вядомы французскі філосаф. Вывучае праблемы чалавека ў свеце моў і тэкстаў, разумення тэкстаў, у тым ліку і гістарычных. Лічыцца адным з найлепшых інтэрпрэтатараў філасофска-гістарычнай тэорыі Х. Уайта.

У сваёй рабоце "Метагісторыя" амерыканскі філосаф Х. Уайт даследуе развіццё гістарычнай навукі ў XIX ст. Ён аналізуе дзейнасць двух супрацьстаяўшых адно аднаму лагераў: гісторыкаў і філосафаў гісторыі.

Уайт вылучае пяць узроўняў канцэптуалізацыі ў гістарычных працах: хроніка, расказаная гісторыя (story); тып пабудовы сюжэта; тып доказу; тып ідэалагічнага падтэксту. Пры гэтым хроніку і расказаную гісторыю патрэбна разглядаць, хутчэй, як папярэдні этап сапраўднай работы гісторыка, этап збору крыніц, адбору і сістэматызацыі іх сведчанняў. Гэты этап з неабходнасцю праходзіць кожны гісторык, якога Уайт разглядае як пасрэдніка паміж "гістарычным полем", неапрацаванай гістарычнай крыніцай, іншымі гістарычнымі сачыненнямі (з аўтарамі якіх гісторык можа спрачацца альбо згаджацца з імі і спасылацца на іх) і аўдыторыяй [1, с. 25].

Спачатку элементы гістарычнага поля складаюцца ў хроніку падзей у тым парадку, як яны адбыліся, а пасля хроніка арганізуецца ў гісторыю празператварэнне падзей у кампаненты "спектру", які мае пачатак, сярэдзіну і канец. Такім чынам, пры стварэнні хронікі і расказанай гісторыі (story) аўтар ужо займаецца тлумачэннем гістарычных падзей праз вылучэнне сярод іх больш значных, вызначальных падзей, а таксама праз "расстаноўку" іх у структуры свайго твора, калі з адных падзей ён пачынае сваё апавяданне, а іншымі заканчвае. Пры гэтым нейкія падзеі характарызуюцца ў тэрмінах матываў завязкі, нейкія – развязкі, нейкія – пераходных матываў.

Але, так сказаць, асноўны тлумачальны эфект, згодна Уайту, належыць тром іншым узроўням канцэптуалізацыі: тлумачэнню праз пабудову сюжэта, тлумачэнню праз доказы і тлумачэнню праз ідэалагічны падтэкст.

Уайт выкарыстоўвае класіфікацыю канадскага літаратуразнаўцы Нортрапа Фрая, паводле якой існуюць чатыры тыпы пабудовы сюжэта: раман, трагедыя, камедыя і сатыра. Пры гэтым рэальныя гістарычныя сачыненні ўтрымліваюць некалькі такіх тыпаў, але дамінуе адзін. Для сюжэта па тыпу рамана характэрна выніковая перамога дабра над злом. Трэба зазначыць, што Фрай, а за ім і Уайт выкарыстоўваюць тэрмін "раман" у значэнні "рыцарскі раман", а не літаратурны раман, звычайны для нас. У Поля Рыкёра дадзены тып

пабудовы сюжэта (у Рыкёра інтрыгі) мае назву "інтрыга па тыпу чароўнай казкі", што, магчыма, больш дакладна перадае характар гэтага тыпу. Герой такой гісторыі перамагае навакольны свет, вызваляецца ад яго і пераўтварае. Архетыпічная схема сатыры прадугледжвае асуджанасць чалавека як нявольніка свету. Пры пабудове сюжэта па тыпу камедыі адбываецца прымірэнне чалавека з іншымі людзьмі, са светам і з грамадствам. У выніку адносіны ў грамадстве становяцца як бы больш чыстымі, згарманізаванымі. Прымірэнне адбываецца і пры пабудове сюжэта па тыпу трагедыі, але яно больш змрочнае. Гэта прымірэнне людзей з умовамі жыцця, вечнымі і нязменнымі. Сатыра можа злучацца з трагедыяй і камедыяй – сатырычная трагедыя, сатырычная камедыя. Камедыя і трагедыя – гэта абмежаванне рамантычнага светаўспрыняцця. Камедыя і трагедыя адносяцца да канфлікту ўсур'ёз. Тым не менш, тут паказана магчымасць прымірэння чалавека са светам. Сатыра пазірае на надзеі, магчымасці і ісціны іранічна, разумеючы крайнюю неадэкватнасць свядомасці поўнаму і шчасліваму прыняццю свету.

Трагедыя і сатыра – спосабы пабудовы сюжэта, характэрныя для гісторыкаў, якія за сумбурам падзей хронікі або ў ім самім бачаць "захоўваючае структуру адносінаў, альбо вечнае вяртанне Таго-Ж-Самага ў Розным" [1, с. 30]. Раман і камедыя прызнаюць узнікненне новых сілаў ці ўмоў на аснове працэсаў, што здаваліся нязменнымі. Такім чынам на ўзроўні пабудовы сюжэта гісторык увасабляе апавядальнае тлумачэнне таго, "што адбылося"

На ўзроўні тлумачэння праз доказы ўжо прысутнічае імкненне праясніць нейкі сэнс таго, што адбылося. Пры дапамозе фармальных доказаў усё, што адбылося і адбываецца ў гісторыі, тлумачыцца на аснове нейкіх прынцыпаў, "якія прапануюцца ў якасці законаў гістарычнага тлумачэння" [1, с. 31]. У гэтым выпадку рэальна адбыўшаяся падзея ў якасці наступства выводзіцца з "універсальнага" закону прычынных узаемасувязяў і гранічных умоў, да якіх дадзены закон прыкладзены.

Саму сваю тыпалогію спосабаў тлумачэння праз фармальныя доказы Уайт запазычыў у Сцівена Пэппера. Ён вылучыў такія тыпы фармальных доказаў, як фармізм, арганіцызм, механіцызм і кантэкстуалізм [1, с. 33].

Фармісцкі тып тлумачэння ідэнтыфікуе унікальныя характарыстыкі аб'ектаў гістарычнага поля. Лічыцца, што калі ідэнтыфікаваны пэўны набор аб'ектаў, вызначаны іх клас, агульныя і спецыфічныя прыкметы, дадзена спецыфічнае найменне, то тлумачэнне адбылося. Да прыхільнікаў дадзенай формы тлумачэння Уайт адносіць Гердэра, Карлейля, Мішле, Нібура і інш. Для іх задача гісторыка – адлюстраванне разнастайнасці, маляўнічасці і жывасці гістарычнага поля з акцэнтам на апісанне унікальнасці дзеючых асоб і сілаў. Да недахопаў фармізма Уайт аднёс вельмі шырокі ахоп, недакладнасць і цьмянасць збагульненняў, што хаваецца за жывасцю і маляўнічасцю апавядання [1, с. 33 — 34].

Для арганіцызму характэрны спробы паказаць дэталі гістарычнага поля як кампаненты сінтэтычнага працэсу, прыхільнасць да парадыгмы "мікракосм – макракосм". Індывідуальныя сутнасці бачацца ў ролі кампанентаў працэсу, які стварае нешта цэлае, што якасна адрозніваецца ад сумы сваіх частак. Прыхільнікі арганіцызму – Ранке, Зібель, Моммзен, Трайчке і інш [1, с. 33 — 34]. Арганіцысцкая стратэгія не шукае законы (у сэнсе класічнай навукі) гістарычнага працэсу. Прыцыпы або ідэі, якія вызначаюць індывідуальныя працэсы ў гістарычным полі, бачацца як акрэсліваючыя мэту, да якой імкнецца працэс як цэлае. Гэтыя прынцыпы не абмяжоўваюць здольнасць чалавека дасягнуць мэты, а гарантуюць фундаментальную чалавечую свабоду.

Механіцысцкія гіпотэзы інтэгратыўныя па мэце, але рэдуктыўныя, а не сінтэтычныя. Учынкі дзеючых асоб гістарычнага поля разглядаюцца як праяўленні нейкай звышгістарычнай сілы. Прыхільнікі гэтага накірунку шукаюць прычынныя законы, што вызначаюць наступствы працэсаў, вядомых у гістарычным полі. Аб'екты гістарычнага поля канструююцца як існуючыя ў мадальнасці адносінаў "частка – частка", іх узаемаадносіны вызначаюцца законамі, якія кіруюць іх узаемадзеяннем. Да такіх механіцыстаў Уайт аднёс Бокля, Тэна, Маркса, Таквіля і інш [1, с. 36]. На іхнюю думку, адкрытыя законы гісторыі кіруюць грамадствам таксама, як законы фізікі – прыродай. Галоўны недахоп гэтага

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

падыходу – абстрактнасць.

Для кантэкстуалізму характэрны тэзіс, адпаведна якому падзеі могуць быць растлумачаны ў рамках кантэксту, у якім адбыліся, праз вызначэнне іх спецыфічных адносін з іншымі падзеямі, якія адбываліся ў акаляючай іх прасторы. Мэта тлумачэння – вызначыць "ніці", што злучаюць вывучаемых індывідаў ці інстытутаў з іх спецыфічным сацыя-культурным сучасным. Згодна Уайту, прыклады кантэкстуалізму можна знайсці ў шэрага гісторыкаў ад Герадота да Хейзінгі, а сярод прадстаўнікоў XIX ст. ён вылучыў Буркхардта [1, с. 37–38]. Кантэкстуалізм вылучае ў якасці аб'екта вывучэння любы аб'ект гістарычнага поля, падбірае "ніці", што звязваюць вывучаемую падзею з рознымі абласцямі кантэксту. "Ніці" вызначаюцца і прасочваюцца ў акаляючую прыроду і сацыяльную прастору, у рамках якой падзея адбылася, а таксама рэтраспектыўна, каб вызначыць "вытокі" падзеі, і перспектыўна, каб вызначыць яе "ўздзеянне" і "ўплыў" на наступныя падзеі. Усё гэта спыняецца ў кропцы, дзе "ніці" знікаюць у кантэксце іншай падзеі або "сыходзяцца", каб абумовіць з'яўленне новай падзеі. У XIX стагоддзі, на думку Уайта, гісторыкі часцей карысталіся стратэгіямі фармізму і кантэкстуалізму. А тых, хто карыстаўся арганіцысцкім і механістычным падыходамі (Гегель, Маркс), разглядалі як філосафаў гісторыі і адносіліся да іх варожа, бо, на думку гісторыкаў, яны рабілі гісторыю менш навуковай. Уайт адзначае, што прычыны непрыняцця гэтых апошніх двух спосабаў тлумачэння з боку гісторыкаў знаходзяцца "хутчэй у па-за эпістэмалагічных меркаваннях": ці то ў некрытычна прынятых поглядах, ці то толькі ў ідэалагічнай пазіцыі [1, с. 38–40].

Тлумачэнне праз фармальны доказ мяжуе з тлумачэннем праз ідэалагічную імплікацыю. Адрозненні паміж імі Уайт бачыць у тым, што апошняе засноўваецца на этычнай пазіцыі, якая няяўна, а магчыма, і несвядома (імпліцытна) уплывае на манеру пісаць гісторыю. Такім чынам, калі папярэдні спосаб тлумачэння датычыць, перш за ўсё, гістарычнага поля, то ідэалагічны спосаб закранае хутчэй прыроду гістарычнай свядомасці, гэта значыць сувязі паміж тлумачэннем мінулых фактаў і цяперашняй практыкі. Тыпалогію ідэалагічных спосабаў тлумачэння Уайт запазычвае, значна перапрацаваўшы, з класіфікацыі ідэалогій Карла Манхейма, які вылучае такія ідэалагічныя пазіцыі, як анархізм, кансерватызм, радыкалізм і лібералізм [1, с. 42].

Французскі філосаф Поль Рыкёр адзначае, што, па-першае, Уайт рэарганізуе суадносіны паміж гісторыяй і вымыслам у межах, адрозных ад межаў эпістэмалогіі, для якой праблематыка аб'ектыўнасці і доказаў вызначае асноўны крытэрый усялякай класіфікацыі форм дыскурсу. Вымысел і гісторыя належаць – з пункту гледжання нарратыўнай структуры – да аднаго і таго ж класа.

Па-другое, збліжэнне гісторыі і вымыслу цягне за сабой збліжэнне гісторыі і літаратуры. Гэтае парушэнне звычайных класіфікацыйных патрабаванняў патрэбна для таго, каб характарыстыка гісторыі як пісання была прынята ўсур'ёз. "Пісанне гісторыі" не ёсць штосьці вонкавае ў дачыненні да канцэпцыі гісторыі і да гістарычнага твору; яно не з'яўляецца і другаснай аперацыяй, якая звязана толькі з рыторыкай камунікацыі і якую можна было б ігнараваць як штосьці, што належыць толькі да сферы літаратурнага афармлення. Яно *канстытутыўнае* для гістарычнага спосабу разумення, гэта значыць, ляжыць у яго аснове, непарыўна з ім. Гісторыя па сваёй сутнасці – гэта *гісторыя-графія* (напісанне гісторыі), артэфакт літаратуры.

Па-трэцяе, намечаная эпістэмолагамі мяжа паміж гісторыяй гісторыкаў і філосафаў гісторыі, павінна быць узята пад сумненне, бо, з аднаго боку, кожны значны гістарычны твор дэманструе цэласнае бачанне гістарычнага свету, а з іншага боку, творы філасофіі гісторыі выкарыстоўваюць тыя ж сродкі артыкуляцыі (выражэння думак), што і значныя гістарычныя творы [2, с. 187]. Таму Уайт ставіць побач гісторыкаў Мішле, Ранке, Таквіля, Буркхардта і філосафаў Гегеля, Маркса, Ніцшэ, Крочэ. "Паэтыку" гістарыяграфіі Уайт называе *метагісторыяй,* каб адрозніць яе ад эпістэмалогіі, што арыентавана на характарыстыку гісторыі як "даследавання" і засяроджанай на ўмовах аб'ектыўнасці і ісціннасці, якія вызначаюць эпістэмалагічны разрыў паміж гісторыяй як навукай і традыцыйным ці

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

міфічным апавяданнем. Пры гэтым слова "паэзія" Уайт разумее ў першапачатковым сэнсе слова "поэйсіс" – стварэнне або выраб чаго-небудзь [3, с. 509].

Рыкёр адзначае, што тры пункты, якія дапускае Уайт, цягнуць за сабой зрушэнне і новую класіфікацыю праблематыкі. У выключнай увазе да ўмоваў "навуковасці" гісторыі Уайт бачыць прычыну няведання тых структур, дзякуючы якім гісторыя ўваходзіць у прастору нарратыўнага вымыслу. Толькі метагісторыя можа адважыцца разглядаць гістарычныя творы як вярбальныя вымыслы, блізкія па змесце і форме да іх літаратурнага аналагу [2, с. 188]. Гэта дапускае перанясенне на гістарыяграфію катэгорый, запазычаных з арсеналу літаратурнай крытыкі. Так, у крытычным разглядзе прац гісторыкаў і філосафаў гісторыі Уайт выкарыстоўвае такія тэрміны, як камедыя, трагедыя, метафара, іронія, метанімія і інш.

Аднак яшчэ Арыстоцель выключыў гісторыю з літаратуры. Ён сцвярджаў, што гісторык і паэт адрозніваюцца не тым, што адзін гаворыць прозай, а другі – вершамі. Гісторык распавядае пра тое, што адбылося, паэт жа, не абмежаваны рамкамі сапраўднасці і мае права на "канструяванне" падзей свайго твору. "Дзякуючы гэтаму, паэзія мае ў сабе больш філасофскага і сур'ёзнага элементу, чым гісторыя: яна паказвае больш агульнае, а гісторыя – частковае". Агульнае для Арыстоцеля з'яўляецца апісаннем таго, што "прыходзіцца гаварыць або рабіць па верагоднасці ці па неабходнасці чалавеку, які мае тыя ці іншыя якасці" [4, с. 1077], гэта значыць не тое, што чалавек зрабіў у дадзенай канкрэтнай сітуацыі, а тое, што ён мог зрабіць, бо мае некаторыя рысы характару.

Парушэнне арыстоцелеўскай забароны аб'ядноўваць гісторыю і літаратуру сустракае супраціўленне з боку літаратуры. Тут уяўляемае часцей вызначаецца праз супрацьпастаўленне "рэальнаму". Па словах Рыкёра, іронія сітуацыі ў тым, што Фрай, класіфікацыю якога актыўна выкарыстоўвае Уайт, з'яўляецца адным з самых актыўных абаронцаў гэтай мяжы: вымысел датычыць магчымага, гісторыя – рэальнага. Паэт творыць, сыходзячы з формы уніфікацыі, а гісторык – у накірунку да гэтай формы [2, с. 188–189].

Метагістрыя, паводле Уайта, павінна зламіць падвойнае супраціўленне: гісторыкаў, мяркуючых, што эпісталярны разрыў паміж гісторыяй і традыцыйным, або міфічным апавяданнем, выводзіць гісторыю са сферы вымыслу; літаратуразнаўцаў, для якіх адрозненне паміж уяўляемым і рэальным з'яўляецца неаспрэчваемай відавочнасцю.

Паводле Рыкёра, для Уайта пабудова інтрыгі (сюжэта) мае істотнае значэнне толькі пры той умове, калі гэтая пабудова цалкам не атаесамляецца з паняццем гістарычнага аповеду, нарратывам. Уайт ставіць перад сабой мэту ўключыць пабудову інтрыгі ў шэраг шматлікіх аперацый, пералічэнне якіх у розных яго творах розніцца. У артыкуле "Структура гістарычнага нарратыва" інтрыга памешчана паміж расказанай гісторыяй і аргументам (доказам). У "Метагісторыі" хроніка папярэднічае расказанай гісторыі, а аргументацыя дапаўняецца ідэалагічным падтэкстам. Расказаная гісторыя мае тут абмежаваны сэнс: паслядоўны расповед з пачаткам, сярэдзінай і канцом. Па Рыкёру, менавіта паняцце "ніць гісторыі" ("story-line") хутчэй за паняцце story служыць арыенцірам. На думку Рыкёра, так Уайт хацеў пазбавіцца ад наступнага аргумента: гісторыя, якой яе пішуць сёння, больш з'яўляецца апавядальнай [2, с. 189–190]. Сам Рыкёр надае вялікую ўвагу пабудове інтрыгі (сюжэта) гістарычнага твора. Па Рыкёру, інтрыга ўжо ў асабістым тэкстуальным полі выконвае функцыю "пасрэдніцтва, якая дазваляе ёй ажыццяўляць, ужо па-за гэтым полем, апасрэдаванне большага маштабу – паміж перадразуменнем і ... пост-разуменнем сферы дзеяння і яго часавых рысаў" [2, с. 80]. Далей Рыкёр адзначае, што інтрыга выконвае пасрэдніцкую ролю па меншай меры ў трох сэнсах.

Па-першае, паміж канкрэтнымі гістарычнымі падзеямі і гісторыяй у цэлым у тым сэнсе, што інтрыга выбірае "асэнсаваную" гісторыю з шэрагу падзей альбо пераўтварае іх у гісторыю. Такім чынам, гістарычная падзея атрымоўвае асэнсаванне ў залежнасці ад свайго месца ў развіцці інтрыгі. Гісторыя, са свайго боку, не можа быць простым пералічэннем падзей у тым парадку, як яны адбыліся, але павінна арганізоўваць іх у тэматычнае выкладанне. Па словах Рыкёра, "пабудова інтрыгі з'яўляецца аперацыяй, што выяўляе канфігурацыю ў прості паслядоўнасці падзей".

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Па-другое, пабудова інтрыгі аб'ядноўвае такія розныя фактары, як агенты, мэты, задачы, сродкі, узаемадзеянні, абставіны, нечаканыя вынікі і г. д.

Па-трэцяе, інтрыга з'яўляецца пасрэдніцай у адносінах да асабістых часавых характарыстык. Усё гэта дазволіла Рыкёру зрабіць абагульненне і назваць інтрыгу "сінтэзам разнароднага" [2, с. 81].

Канфігуруючы акт пабудовы інтрыгі складаецца з аб'яднання таго, што Рыкёр называе "гістарычнымі здарэннямі"; з гэтай шматлікасці падзей канфігуруючы акт вылучае адзінства часавай цэласнасці. Гэта дае магчымасць чытачу прасачыць гісторыю, гэта значыць, "рухацца наперад праз выпадковасці і перыпетыі, падпарадкоўваючыся чаканню, якое выконваецца напрыканцы", якое не выводзіцца з нейкіх перадумоў. Яно надае гісторыі "канцавы пункт", які, у сваю чаргу, вызначае пункт гледжання для разумення гісторыі як адзінага цэлага [2, с. 82–83].

Неабходна адзначыць, што цэльнасць кампанентаў работы гісторыка наўрад ці можа быць дасягнута толькі пры дапамозе пабудовы інтрыгі (сюжэта). Не спрачаючыся наконт важнасці дадзенай працэдуры, зазначым, што ўжо пры пабудове яе гісторык выкарыстоўвае некаторыя спробы аргументацыі, тлумачэння адбыўшыхся падзей, што залежыць ад той парадыгмы, праз якую ён разглядае гэтыя падзеі. А ў фарміраванні гэтай парадыгмы вялікую ролю адыгрывае этычная пазіцыя гісторыка, а гэта тое, што Уайт называе тыпам ідэалагічнага падтэксту. Такім чынам, сама пабудова інтрыгі шмат у чым вызначаецца тыпам аргументацыі гісторыка і яго ідэалагічнай пазіцыяй.

Рыкёр адзначае, што разумець гісторыю – гэта значыць разумець, як і чаму ідучыя адзін за адным эпізоды прывялі да такога завяршэння, якое зусім не прадугледжвалася загадзя, але, у рэшце рэшт, павінна быць прымальным, "бо яно адпавядае сабраным разам эпізодам" [2, с. 82]. Аднак такое разуменне цяжка суаднесці толькі з працэсам пабудовы інтрыгі. Тут вялікую ролю адыгрываюць і іншыя ўзроўні канцэптуалізацыі, выдзеленыя Уайтам.

Больш важным у гісторыі, чым у літаратуразнаўстве, для Уайта размежаванне паміж story і інтыгай, паколькі ў гісторыі падзеі, што ствараюць лінію расказанай гісторыі, не ствараюцца фантазіяй, а праходзяць праз працэдуру аргументацыі. Але гэтае адрозненне не заўсёды лёгка адстойваць, таму што story – гэта спосаб арганізацыі, чым яна і адрозніваецца ад звычайнай хронікі падзей; яна арганізуецца ў адпаведнасці з "матывамі" ці "тэмамі", якія злучаюць або размяжоўваюць у ёй асобныя часткі. Расказаная гісторыя ўжо мае "тлумачальны эфект". Таму "Метагісторыя" адрознівае яе ад хронікі, якая становіцца першаснай артыкуляцыяй гістарычнага поля. Паняцце "гістарычнае поле" само ставіць праблему папярэдняй артыкуляцыі (выражэння праз тэрміны).

Паводле Рыкёра, пабудова інтрыгі, у адрозненне ад расказанай гісторыі, захоўвае тлумачальны эфект, у тым сэнсе, што яна вызначае не падзеі расказанай гісторыі, а саму гэтую гісторыю, вызначаючы клас, да якога яна належыць. Ніць расказанай гісторыі дазваляе выявіць адзіную канфігурацыю, пабудова сюжэта пабуджае да прыняцця традыцыйнага класа канфігурацыі. Гэтыя катэгорыі інтэрпрэтацыі, у адпаведнасці з якімі закадзіравана сама гісторыя, а не падзеі гісторыі, родныя тым "адносным крыптаграмам", якія, па словах Э. Х. Гумбрыха (работа "Art and Illusion"), вызначаюць наш спосаб "прачытання" жывапісу [2, с. 190].

Пад пабудовай сюжэта Уайт разумее штосьці большае, чым простае спалучэнне лінейнага аспекту расказанай гісторыі і аргументаванага аспекту абараняемага тэзісу. Пад гэтым ён мае на ўвазе тып, да якога адносіцца расказаная гісторыя, гэта значыць адну з тых катэгорый канфігурацыі, якія мы навучыліся вылучаць, дзякуючы нашай культуры. Уайт звяртаецца да ролі парадыгм у пабудове інтрыгі і да фарміравання апавядальнай традыцыі шляхам узаемадзеяння *інавацыі і седзіментацыі**. Для пабудовы інтрыгі Уайт захоўвае адзіную функцыю катэгарызацыі: гэтым тлумачыцца і тое, што ён прыпісвае паняццю story

* Працэс замацавання ў свядомасці індывіда ведаў, атрыманых у ходзе жыццядзейнасці і прыдатных для перадачы наступным пакаленням пры дапамозе мовы.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

чыста лінейны аспект. Зразумелая такім чынам пабудова інтрыгі ўяўляе сабой спосаб тлумачэння: "тлумачэнне праз пабудову інтрыгі". Тут паняцце "растлумачыць" азначае даць накірунак для ідэнтыфікацыі класа пабудовы інтрыгі. Па Уайту, гісторык вымушаны ўключаць у інтрыгу свае гісторыі (story), якія складаюць яго расповед, у адзінай, усеахопліваючай або архетыпічнай форме [1, с. 495].

Паводле Рыкёра, ва ўсіх спосабах тлумачэння праз пабудову сюжэта можна пабачыць эпістэмалогію гістарычнага пазнання, галоўным чынам, тэорыю гістарыяграфічнага стылю, "калі разумець пад стылем характэрнае ўзаемаперакрыжаванне магчымасцей, што адкрываюцца дзякуючы розным нарратыўным катэгорыям, пра якія ідзе гаворка" [2, с. 193].

На першым узроўні тэорыя стылю заснавана на базавай трыядзе: расказаная гісторыя, пабудова сюжэта, аргументацыя. Так, у вядомага нямецкага гісторыка XIX стагоддзя Леапольда фон Ранке ў "Гісторыі Германіі ў эпоху Рэфармацыі" ніці гісторыі пабудаваны ў лінейным парадку: пачатак, сярэдзіна і канец гісторыі да цяперашняга часу. У аснову яго аргументацыі пакладзены змены, што адбываюцца ў нямецкай сутнасці, захоўваючай сваю ідэнтычнасць. Сюжэт абмяжоўваецца дэманстраваннем таго, "як адно прывяло да іншага". У гэтым сэнсе для Ранке ўсё ёсць story (гэта – "нарратывісцкі" тып гістарыяграфіі). У французскага аўтара Алексіса дэ Таквіля ў яго кнізе "Дэмакратыя ў Амерыцы" таксама ёсць story, але з невядомым канцом – нам трэба яе завершыць. Яго расказаная гісторыя – толькі "сярэдзіна". Акцэнт робіцца на структурным тыпе, які аб'ядноўвае класы, палітычную дэмакратыю, культуру, рэлігію і г. д. У знакамітага швейцарскага гісторыка Якаба Буркхардта ў яго даследаванні "Культура Адраджэння ў Італіі" ўсё ёсць аргумент: расказаная гісторыя толькі ілюструе тэзіс пра індывідуалізм у эпоху Рэнесансу.

На другім узроўні тэорыя гістарычнага стылю камбінуе трохчленны падзел – расказаная гісторыя, сюжэт, аргумент – з тыпалогіяй пабудовы сюжэта. Пры гэтым, калі ў Буркхардта назіраецца прымат аргументу над расказанай гісторыяй і сюжэтам, то ў яго ж – і прымат іранічнага модуса пабудовы сюжэта, бо гісторыя, якая нікуды не рухаецца, руйнуе чаканні маральнага або інтэлектуальнага завяршэння. Мішле аддае перавагу мадэлі чароўнай казкі, Ранке – камедыі, Таквіль – трагедыі.

Трэці ўзровень тэорыі гістарычнага стылю ўяўляе сабой камбінаванне трох тыпаў гістарычнага тлумачэння: пабудовы сюжэта, аргументацыі і ідэалагічнай імплікацыі. Тут можна дабіцца камбінавання, якое ўлічвае калі не ўсе магчымыя спалучэнні, то ўсе формы "выбранага зрадства", гэта значыць тыя, якія аб'ядноўваюць тыпы тлумачэння, што можна спалучаць.

Рыкёр не пагаджаецца з разуменнем гістарычнага стылю як камбінацыі спосабаў пабудовы інтрыгі, аргументацыі і ідэалагічнага падтэксту. Стыль для яго – гэта хутчэй гібкае ўзаемадзеянне форм "зрадства". Ён цытуе самога Уайта: "У кожным выпадку дыялектычная напружанасць развіваецца ў кантэксце звязнага бачання або дамінуючага вобраза формы цэлага гістарычнага поля. Гэта прыдае канцэпцыі вымярэнне самадапасаванай татальнасці. Звязнасць і дапасаванасць прыдаюць рабоце яе асаблівыя стылістычныя атрыбуты" [1, с. 50]. Паводле Рыкёра, вынік такога напружання – несугучная сугучнасць: па-першае, апазіцыя трох спосабаў, што, узятыя разам, надзяляюць нарратыўныя структуры тлумачальнай функцыяй; па-другое, сутыкненне некалькіх модусаў пабудовы сюжэта не толькі ў розных гісторыкаў, але і ўнутры аднаго вялікага твора [2, с. 194].

Уайт адзначае, што адной з асноўных праблем у дадзеным выпадку з'яўляецца вызначэнне аснавання гэтай звязнасці і дапасаванасці. Ён сцвярджае, што гэтыя аснаванні па сваёй сутнасці "паэтычныя". Па Уайту, перш чым гісторык зможа падвесці дадзеныя гістарычнага поля пад "канцэптуальны апарат", ён павінен "прэфігураваць гэтае поле, гэта значыць канстытуяваць яго як аб'ект разумовага ўспрыняцця" [1, с. 50]. Уайт параўноўвае гісторыка, які сутыкнуўся з гістарычным полем з граматыкам, які сутыкнуўся з новай мовай. Гісторык павінен спачатку канстытуяваць моўны пратакол, "выкананы ў лексічным, сінтаксічным і семантычным вымярэнні", а на аснове гэтага – ахарактарызаваць гістарычнае поле і яго элементы ў тэрмінах самага гісторыка, а не дакумента. Гэтым гісторык

РЭПАЗІТОРЫЙ ГГУ ІМЕНІ Ф. СКАРЫНЫ

падрыхтоўвае тлумачэнне і рэпрэзентацыю гістарычнага поля, што і адбываецца ў гістарычным апавяданні. Уайт адзначае, што гэты "моўны пратакол, дзякуючы сваёй па сутнасці прэфігуратыўнай прыродзе, можа быць апісаны з пункту гледжання дамінуючага трапалагічнага тыпу, у якім ён выкананы [1, с. 51]. Каб уявіць, "што сапраўды адбылося ў мінулым", гісторык спачатку павінен прэфігураваць як магчымы аб'ём ведаў увесь набор падзей, што маюцца ў дакументах. На думку Уайта, прэфігуратыўны акт – гэта акт паэтычны, бо "ў свядомасці гісторыка ён дакагнітыўны і некрытычны", а таксама таму, што "з'яўляецца канстытутыўным актам структуры, якая паслядоўна будзе адлюстроўвацца ў славеснай мадэлі, прапанаванай гісторыкам як рэпрэзентацыя таго, што сапраўды адбылося ў мінулым" [1, с. 51].

Рыкёр зазначыў, што гэтая трайная тыпалогія будуецца не на аснове логікі. Модусы пабудовы сюжэта, у прыватнасці, з'яўляюцца прадуктамі традыцыі пісання, якую выкарыстоўвае гісторык.

Аспект традыцыйнасці ў рэшце рэшт найбольш важны: гісторык, будучы пісьменнікам, звяртаецца да публікі, здольнай распазнаць традыцыйныя формы апавядання. Структуры не застылыя правілы, не класы, абумоўленыя апрыёрнай таксаноміяй. Гэта формы культурнай спадчыны. Калі можна сказаць, што ніводная падзея сама па сабе не з'яўляецца трагічнай, і толькі гісторык паказвае яе такой, вызначаным чынам кадзіруючы яе, то гэта таму, што самавольства кадзіравння абмежавана не расказанымі падзеямі, а спадзяваннем чытача сустрэць вядомыя яму формы кадзіравання. "Такім чынам, кадзіраванне ў большай ступені вызначаецца чакаемым сэнсавым эфектам, чым кадзіруемым матэрыялам" [2, с. 195].

Гэты сэнсавы эфект заключаецца галоўным чынам уператварэнні невядомага ў вядомае. Кадзіраванне садзейнічае гэтаму ў той меры, у якой гісторык падзяляе са сваёй аўдыторыяй разуменне форм, "у якія павінны ахінуцца значныя сітуацыі чалавечага жыцця, дзякуючы ўдзелу гісторыка ў спецыфічным працэсе фарміравання сэнсу, і з-за якіх ён з'яўляецца ўдзельнікам хутчэй знакавай культуры спадкаемнасці, чым іншай" [1, с. 50].

Рыкёр лічыць пабудову інтрыгі асноўным тлумачальным сродкам з тых, што выкарыстоўвае гісторык. Для яго пабудова інтрыгі – штосьці нашмат большае, чым адна частка працэсу, роўная з іншымі. Менавіта яна ажыццяўляе пераход ад апавядання да тлумачэння [2, с. 195].

На думку Рыкёра, цяжка размежаваць інтрыгу і аргумент. Аргумент абазначае ўсё тое, вакол чаго круціцца гісторыя. Можна сказаць, што гістарыяграфія, у адрозненне ад літаратурных форм (эпапеі, трагедыі і камедыі), патрабуе адрознення інтрыгі і аргумента на ўзроўні "тлумачальных эфектаў" [2, с. 190–191]. Далей Рыкёр адзначае, што, таму што тлумачэнне праз аргументацыю можна адрозніць ад тлумачэння праз пабудову інтрыгі, логікі прыдумалі намалагічную мадэль. Гісторык будуе аргументацыю фармальным, эксплiцытным (яўным, непрыхаваным), дыскурсіўным чынам. Але прыхільнікі намалагічнай мадэлі не заўважылі, што поле аргументацыі больш шырокае за поле агульных законаў, якія запазычваюцца ў сумежных навук, што ўжо склаліся па-за гістарычным полем. У гісторыка маецца свой асабісты спосаб аргументацыі, які яшчэ адносіцца да сферы апавядання. І такіх спосабаў аргументацыі настолькі шмат, што патрабуецца іх асобная тыпалогія.

Кожны спосаб аргументацыі выражае дапушчэнні метагістарычнага характару пра саму прыроду гістарычнага поля і пра тое, чаго можна чакаць ад гістарычнага тлумачэння.

Што датычыць такога тыпу гістарычнага тлумачэння, як ідэалагічны падтэкст, то, на думку Рыкёра, увядзеннем гэтага паняцця Уайт задавальняе двум розным, калі не супрацьлеглым, патрабаванням. З аднаго боку, ён, клапоцячыся пра дакладнасць, зноў уводзіць пры дапамозе постмарксісцкага паняцця ідэалогіі кампаненты гістарычнага пазнання, якія пастаянна высоўвала на першы план парадыгма *Разумення* (*Verstehen*): гаворка вядзецца пра ўцягнутасць гісторыка ў гістарычную работу, пра даследаванне і разуменне каштоўнасцей і пра сувязь гісторыі з дзеяннем у сучасным свеце. Ідэалагічныя меркаванні, якія датычаць, у рэшце рэшт, сацыяльных змен, іх жаданага маштабу і тэмпу,

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

маюць адносіны да метагісторыі ў той меры, у якой яны ўбудаваны ў тлумачэнне гістарычнай сферы і ў структуру вербальнай мадэлі, праз якую гісторыя арганізуе падзеі і працэсы ў апавяданні. З іншага боку, праводзячы адрозненні паміж аргументацыяй і ідэалогіяй, аўтар паказвае месца самой крытыкі ідэалогіі і падпарадкоўвае ідэалогію тым жа правілам абмеркавання, якімі кіруецца спосаб тлумачэння праз фармальныя доказы.

Такім чынам, сярод вылучаных Уайтам узроўняў канцэптуалізацыі структуру гістарычнага тлумачэння складаюць: тлумачэнне праз пабудову сюжэта (інтрыгі), тлумачэнне праз фармальныя доказы (аргументацыю), тлумачэнне праз ідэалагічны падтэкст (імплікацыю). Такія ўзроўні канцэптуалізацыі, як хроніка і расказаная гісторыя (story) могуць быць разгледжаны як папярэднія. Уайт удзяляе належную ўвагу ўсім названым спосабам тлумачэння, адзначаючы іх узаемазвязанасць і ўзаемаабумоўленасць, з чым можна пагадзіцца. Рыкёр вылучае як галоўны кампанент пабудову інтрыгі. Аднак пры пабудове яе гісторык яўна ці схавана выказвае свае адносіны да тых падзей, якія апісвае. Нават у самім факце напісання працы па нейкай канкрэтнай тэме часта хаваецца ацэнка гісторыкам тых падзей, пра якія ён піша. Нават, калі гісторык не дае адкрытых ацэнак, ён усё ж "вымушаны" неяк ацаніць тое, пра што ён піша, што даследуе. Тут неабходна падкрэсліць, што гэтая ацэнка залежыць, у рэшце рэшт, ад таго, што Уайт называе ідэалагічнай пазіцыяй. Гэта значыць, што пабудова сюжэта шмат у чым залежыць ад таго, які ідэалагічны падтэкст закладваецца ў твор. Так, напрыклад, гісторык-радыкал наўрад ці надасць сваёй рабоце, прысвечанай гісторыі Французскай рэвалюцыі, сюжэт рамана (чароўнай казкі). Акрамя таго, на тып сюжэта несумненна будзе ўплываць і той спосаб аргументацыі, які характэрны для дадзенага гісторыка. А сам спосаб аргументацыі, у сваю чаргу, шмат у чым вызначаецца той жа ідэалагічнай пазіцыяй аўтара і наадварот.

Такім чынам, Уайт і Рыкёр вызначылі тры асноўныя тыпы гістарычнага тлумачэння: праз пабудову сюжэта, праз фармальныя доказы і праз ідэалагічны падтэкст. Пры гэтым яны усе ўплываюць на гісторыкаў, вызначаючы структуру, характар іх твораў. Вылучаць нейкі адзін тып тлумачэння як асноўны, на наш погляд, немэтазгодна і няправільна.

**Abstract.** The paper analyses an important aspect of the philosophic-historical consept of a modern American philosopher H.White, his approach to the problem of historic interpretation. The outlooks on the problem of a French philosopher P.Riker who is considered to be the best interpreter of H.White are also presented.

## Літаратура

1. Уайт, Х. Метаистория: Историческое воображение в Европе XIX века / Х. Уайт. – Екатеринбург, 2002.

2. Рикёр, П. Время и рассказ / П. Рикёр. – М., – СПб., 2000. – Т.1.

3. Турбина, Е. «Метаистория» и историки // Уайт Х. / Метаистория : Историческое воображение в Европе XIX века. – Екатеринбург, 2002.

4. Аристотель. Этика. Политика. Риторика. Поэтика. Категории / Аристотель. – Мн., 1998.

Гомельскі дзяржаўны універсітэт
імя Францыска Скарыны

Паступіла 16.12.08

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ